# Веснік Глыбоччыны

Вішнёвый фестиваль ГЛУБОКОЕ 2014

Газета раённага выканаўчага камітэта і раённага Савета дэпутатаў

www.vg-gazeta.by субота, 19 ліпеня 2014 года № 57 (9401)


# Дарагім гасцям мы рады!



Фотакалаж Андрэя ПАНКРАТА.

Ніводнае наша раённае свята альбо фестываль немагчыма ўявіць без выстаў цудоўных работ майстроў раённага Дома рамёстваў, народных майстроў народнага клуба "Крыніца", самадзейных мастакоў Глыбоччыны, ткачых, вышывальшчыц, разьбяроў... Гэтыя таленавітыя творчыя людзі, выдатныя ўмельцы актыўна адраджаюць і папулярызуюць народнае прыкладное мастацтва нашага краю. Тканыя сурвэткі і абрусы, вырабы з гліны і саломкі – кожны выраб, кожная рэч з'яўляюцца сапраўдным мастацкім творам, які сімвалізуе непаўторнае багацце і прыгажосць роднага краю, знаёміць шматлікіх гасцей раёна з нашымі традыцыямі.

І на сёлетнім "Вішнёвым фестывалі" кожны народны творца прапануе гасцям разнастайныя "вішнёвыя" сувеніры. А выдатным дапаўненнем да прэзентацыі нашага фестывальнага брэнда стане яшчэ і выстава малюнкаў юных глыбачан, вучняў раённай мастацкай школы імя Язэпа Драздовіча "Вішнёвая рапсодыя".

– Сардэчна запрашаем, дарагія сябры, на фестывальныя пляцоўкі – атрымаеце незвычайную вішнёвую асалоду для душы! – кажуць, сустракаючы гасцей з вішнёвым пірагом, майстры раённага Дома рамёстваў Алена Дабравольская і Віктар Дудкевіч.

## Уважаемые участники и гости районного праздника «Вишнёвый фестиваль-2014»!

Сегодня в нашем прекрасном городе, который только что отметил своё 600-летие, во второй раз звучат позывные «Вишнёвого фестиваля». Этот замечательный праздник, снискавший району брэндовую популярность, собрал в Глубоком многочисленных друзей с различных уголков Беларуси, а также из стран зарубежья. На многочисленных фестивальных площадках пройдут театрализованные представления, захватывающие конкурсы и весёлые забавы, игры, концерты и дискотеки. Этот поистине уникальный региональный культурный проект позволяет возродить и приумножить народные традиции и обычаи нашего края. Он близок, понятен и дорог каждому — от мала до велика.

Нынешний «Вишнёвый фестиваль» ознаменован двумя важными юбилейными датами в жизни нашего края и страны – 70-летием освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков и 600-летием родного Глубокого.

Надеемся, что фестиваль сохранит присущую ему необычайно тёплую и, на самом деле, сладостно-радостную атмосферу. Уверены, что все мероприятия праздничного дня вызовут неподдельный интерес у каждого из вас и оставят в памяти неизгладимое впечатление.

От всей души желаем всем вам, дорогие друзья, творческих открытий, интересных встреч, незабываемых, ярких впечатлений, солнечного очарования, летнего раздолья и весёлого настроения! Да здравствует «Вишнёвый фестиваль-2014»!

**О. МОРХАТ,**
**председатель Глубокского районного исполнительного комитета,**
**Г. УНУКОВИЧ,**
**председатель Глубокского районного Совета депутатов.**

*Музыка Б. Грамакоўскага.*
*Словы А. Жыгунова.*

## Глыбокае – вішнёвы гарадок

Куды ні глянеш – сад альбо садок.
Тут прыгажосцю можна наталіцца.
Глыбокае маё – вішнёвы гарадок,
Такая вось вішнёвая сталіца.
Глыбокае маё –вішнёвы гарадок,
Такая вось вішнёвая сталіца.

**Прыпеў:**
*Вішні у кожным садзе,*
*Вішні ў тваім паглядзе,*
*Вішні паспелі у Глыбокім.*
*Вішні у кожным доме,*
*Вішнямі мы вядомы*
*У бліжнім замежжы і ў далёкім.*

За летам восень просіцца ў радок,
А хочацца пабачыць саду квецень.
Глыбокае маё – вішнёвы гарадок,
Вясновы самы на усёй планеце.
Глыбокае маё – вішнёвы гарадок,
Вясновы самы на усёй планеце.

Цвітуць сады, і ружавее даль,
І пачуццём ты поўнішся высокім.
І спадзяёмся, што "Вішнёвы фестываль"
Штогод збіраць нас будзе у Глыбокім.
Хай запрашае нас "Вішнёвы фестываль"
Праз год ізноў сустрэцца у Глыбокім.

**Прыпеў.**

## ПРОГРАММА
## проведения районного праздника «Вишнёвый фестиваль»

**10.00** Открытие выставки рисунков «Вишневая рапсодия»
*ГЦК (ул. Ленина, 40)*

**11.00** Театрализованное представление «В королевстве вишен». Театрализованное шествие
*Площадка с монументально-декоративной скульптурой «Вишенка»*

**11.40 – 12.00** Торжественное открытие праздника

**12.00 – 13.15** Праздничный концерт «Спелых вишен аромат»
*Центральная площадь*

**14.00 – 15.00** Торжественная регистрация брака «Вишневая свадьба»
*Сквер молодоженов*

**15.00 – 16.30** Семейный конкурс «В гостях у вишенки»

**17.00 – 18.00** Закрытие праздника: подведение итогов конкурсов «Лучший вишневый двор», подворий, аукцион «Вишневый пирог»

**18.10 – 19.30** Эстрадная программа «Вишневое лето»

**19.30 – 23.00** Дискотека «Даешь вишневое настроение»

**9.00 – 13.30** Вишнёвая ярмарка «Кладовая сочных ягод»

**9.00 – 19.00** Работа подворий сельских Советов и сельскохозяйственных предприятий и организаций города

**9.00 – 19.00** Город мастеров "Самародкі зямлі Глыбоцкай"

**9.00 – 19.00** Выставка рушников "Вішнёвы гасцінец"
*Центральная площадь*

**10.00 – 19.00** Игры, конкурсы, аттракционы, катание на конях
*Детская площадка «Бригантина»*

**10.00 – 19.00** Катание на лодках, катамаранах
*Озеро Кагальное*

√ *КЛОПАТЫ РАЁННАЙ УЛАДЫ*

# Пытанням сельгасвытворчасці – неаслабная ўвага

На рабочай нарадзе, якую праводзіў на пачатку гэтага тыдня старшыня раённага выканаўчага камітэта Алег Морхат, заслухоўвалася справаздача старшыні Псуеўскага сельвыканкама Тамары Верташонак аб стане спраў на падведамаснай тэрыторыі. Асаблівая ўвага завастралася на найбольш праблемных пытаннях. У прыватнасці, аналізавалася дэмаграфічнае становішча, развіццё асабістых падсобных гаспадарак і ход закупу сельгаспрадукцыі з асабістых падвор’яў грамадзян, выкананне мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні населеных пунктаў.

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў нарады знаходзіліся таксама самыя надзённыя пытанні сельгасвытворчасці, такія, як падрыхтоўка і арганізацыя ўборачных работ, павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў гаспадарках раёна, асабліва малака і мяса, узмацненне мер прафілактыкі супраць афрыканскай чумы, а таксама захаванне здаровых і бяспечных умоў працы на вытворчасці, у арганізацыях і ва ўстановах раёна.

**А. УСЦІНАЎ.**

# Уважаемые глубочане, жители района!

Ещё у всех свежи воспоминания о недавних юбилейных торжествах по случаю 600-летия нашего любимого и неповторимого по своей красоте города Глубокое. Возвышенные, прекрасные чувства переполняют наши сердца от тех волнующих встреч, театрализованных представлений и концертов, от музыки, песен и ярких огней праздничного салюта.

К этим радостным дням мы шли дружной, сплочённой семьёй. И не просто шли. Объединившись в достижении поставленной цели, глубочане работали с огромным вдохновением. Каждый готовил родному городу свои подарки: кто-то посадил деревца, украсил свою усадьбу, кто-то побеждал в престижных конкурсах и соревнованиях, кто-то слагал и посвящал Глубокому стихи и песни... Все вы, дорогие земляки, неустанно и много трудились и продолжаете трудиться в заводском цеху, в поле, на животноводческой ферме, укрепляя тем самым экономическую составляющую нашего Глубокского края.

Абсолютное большинство жителей района в который раз, как и во время подготовки к праздничным мероприятиям, и в дни юбилейных торжеств, зарекомендовали себя прекрасными хозяевами, доказали, что умеют и сами содержательно отдыхать, и гостей принимать.

Обращаясь сегодня от имени районного исполнительного комитета и районного Совета депутатов к вам, наши неутомимые труженики Глубоччины, хочу искренне поблагодарить всех за тот весомый вклад, который вы внесли в подготовку и проведение юбилейных мероприятий. Самые признательные слова благодарности за участие и поддержку всех идей и начинаний выражаю нашему уважаемому депутату, председателю Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь Владимиру Павловичу Андрейченко, руководству Витебской области во главе с председателем облисполкома Александром Николаевичем Косинцем, духовенству православной и католической конфессий и лично Их Высокопреосвященству архиепископу Полоцкому и Глубокскому Феодосию и бискупу Витебской диоцезии Олегу Буткевичу, всем нашим землякам, прославляющим своим трудом Глубоччину за её пределами, а также нашим зарубежным друзьям и коллегам.

Время уже отсчитывает дни следующего, седьмого, столетия в истории родного города, и мы уверенно продолжаем свой путь в будущее. Перед каждым из нас, дорогие друзья, стоят большие задачи по укреплению экономики нашего края и страны, укреплению нашего общего благосостояния. Наш гражданский, патриотический долг — трудиться ещё больше, ещё старательнее на благо родного города и района, на благо наших детей и внуков. Только вместе, шагая плечом к плечу, работая с чувством высокой ответственности, мы сможем выполнить все поставленные задачи, воплотить в жизнь все наши планы.

**О. МОРХАТ,**
**председатель Глубокского районного исполнительного комитета.**

# Фарбы фестывальнага Віцебска

На пачатку гэтага тыдня XXIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» развітаўся са сваімі сябрамі і прыхільнікамі. На заключным гала-канцэрце па традыцыі былі ўручаны Гран-пры пераможцам Міжнародных конкурсаў.

Упершыню Гран-пры XXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2014» адправіцца за акіян: спявак з Мексікі Радрыга дэ ла Кадэна атрымаў найбольшую колькасць балаў ад журы. Канкурсант з Беларусі Артур Міхайлаў атрымаў спецыяльны прыз Саюзнай дзяржавы.

Гран-пры XII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2014» толькі аднойчы перасячэ мяжу, бо яго атрымала Анастасія Багінская з суседняй Украіны.

Маленькія выканаўцы-беларусачкі таксама не засталіся без узнагарод: Дыплома лаўрэата І Прэміі ўдастоена Зінаіда Купрыяновіч, у Міланы Рэдчанка – спецыяльная прэмія Саюзнай дзяржавы.

Скарбонку ўзнагарод, заваяваных беларусамі на фестывалі «Славянскі базар у Віцебску», папоўніла і наша глыбачанка – Святлана Скавырка, майстар па роспісе палатна. Яна прыняла ўдзел у міжнародным сваце-конкурсе традыцыйнага і сучаснага мастацкага роспісу “Фарбы нябёсаў” і заваявала галоўны прыз – Гран-пры конкурсу. Віншуем Святлану з перамогай!

Пра сустрэчу з майстрам і яе “залаты” твор чытайце ў наступным нумары газеты.

***

У фестывальным Віцебску, дарэчы, пабывалі і многія нашы глыбачане, каб акунуцца ў святочную атмасферу і, як кажуць, на іншых паглядзець і сябе паказаць. І, канешне, заглянуць на падвор’е да сваіх землякоў.

– Я – сама глыбачанка, – хвалебны водгук у адрас нашых землякоў выказала знаёмая. – І такое пачуццё гордасці адчула, калі падыходзіла да Глыбоцкага падвор’я. Там нашмат болей гасцей фестывалю збіралася, чым дзе. Дзяўчаткі з райспажыўтаварыства сустракалі ў прыгожанькіх фартушках з лагатыпам “Вішнёвага фестывалю”. І ля майстроў нашых круціліся пакупнікі. А колькі сабрала вакол сябе гледачоў Найля Валіева! Якраз у момант яе выступлення мы праходзілі міма. Эмоцыі захаплення і гордасці за людзей нашага краю перапаўнялі і мяне…

**А. ГЛІНСКАЯ.**

# Глыбоцкае РайСТ – пераможца абласнога агляду-конкурсу

***У Полацкім гандлёва-тэхналагічным каледжы Белкааптаварыства праходзіў абласны агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці сярод работнікаў і калектываў арганізацый і ўнітарных прадпрыемстваў спажывецкай кааперацыі вобласці. Удзел у ім прынялі дваццаць калектываў раённых спажывецкіх таварыстваў, у ліку якіх было і Глыбоцкае РайСТ.***




**Пераможцы абласнога агляду-конкурсу – самадзейныя артысты з Глыбоцкага РайСТ.**

—На працягу трох апошніх гадоў мы займалі ў вобласці першыя месцы і сёлета зноў даказалі званне абсалютных лідараў, — гаворыць старшыня прафкама РайСТ Марына Ждановіч. – У праграме нашага паўгадзіннага выступлення былі вакальныя і сольныя спевы, танец, мастацкае чытанне і арыгінальны жанр. Фактычна мы падрыхтавалі нумары ў кожнай намінацыі.

У выкананні глыбачан на канцэрце прагучалі песні “Сукенка ў гарошак”, “Сустрэча з домам”, “Святы”, верш “Развітанне”. Яны выканалі танец “Язмін” і паказалі п’есу-пародыю “Казка пра рыбака і рыбку” па матывах твора Аляксандра Пушкіна, пераведзеную на сучасны лад. Сярод выступоўцаў былі людзі розных прафесій: бухгалтары, эканаміст, кандытар, аператар ЭВМ, маркетолаг, афіцыянт, слесар-сантэхнік і грузчык.

Пры падвядзенні вынікаў журы прымала да ўвагі выканаўчае майстэрства, тэматыку выступлення, рэжысуру праграмы, якасць музычнага суправаджэння і сцэнарыя, касцюміраванне і разнастайнасць жанраў.

Другое месца занялі супрацоўнікі Лепельскага РайСТ, на трэцім аказаліся суседзі з Докшыцкага РайСТ.

**Галіна СУТУЛА.**
**Фота з архіва арганізацыі.**

√ *АДУКАЦЫЯ*

# “Залаты клас” Алены Калбасіч

***Сёлета ў раёне з залатымі медалямі скончылі школу адзінаццаць выпускнікоў. З іх шэсць медалістаў — Наталля Шур, Марыя Гінько, Вікторыя Казак, Аляксандра Сініца, Кацярына Скрабнеўская і Святлана Хайноўская – вучні СШ №2 горада Глыбокае. Пяцёра з іх — вучні 11 “А” класа, у якім класным кіраўніком працавала настаўніца рускай мовы і літаратуры Алена Канстанцінаўна Калбасіч.***

Школьныя поспехі вучняў, вядома ж, гэта радасць і для іх саміх, і для бацькоў, і для настаўнікаў. А калі яшчэ выпускнікі выдатна справіліся з заданнямі прадметнага тэсціравання, то і адзнакі свае апраўдалі, і вагу атрыманых медалёў адчулі, і ў чарговы раз пацвердзілі прафесіяналізм выкладчыкаў, якія займаліся з імі шмат гадоў.

Вучаніца 11 “А” класа Вікторыя Казак атрымала 100 балаў на тэсціраванні па грамадазнаўстве, вучаніца 11 “Б” Наталля Шур – набрала 100 балаў па беларускай мове, 98 балаў па рускай мове ў Марыі Гінько, 92 балы – па гэтым жа прадмеце ў Аляксандры Сініцы...

Што датычыць паступлення, то з дваццаці выпускнікоў 11 “А” класа дзевятнаццаць сталі студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў, чым і пацвердзілі свае школьныя адзнакі і якасць атрыманых атэстатаў. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, педагагічнага ўніверсітэта імя Машэрава, Акадэміі спорту і турызму, Наваполацкага дзяржаўнага ўніверсітэта глыбоцкія выпускнікі будуць працаваць лінгвістамі, прававедамі, спецыялістамі ў сферы радыёэлектронікі, бізнесу і міжнародных камунікацый, настаўнікамі...

Усе яны, без сумневу, заявяць пра сябе і будуць паспяховымі, але, спадзяёмся, ніколі не забудуць сваіх настаўнікаў, якія далі ім якасныя трывалыя веды, навучылі працавітасці, дапамаглі зрабіць правільны выбар у жыцці і ажыццявіць запаветную мару.

**Г. ЗВОНКА.**

# *Аб’яўлена падзяка*

Аб’яўлена Падзяка старшыні Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта за ўзорнае выкананне службовага абавязку, ініцыятыву і стараннe, праяўленыя пры забеспячэнні грамадскага парадку і дарожнай бяспекі падчас правядзення святочных мерапрыемстваў у г. Глыбокае наступным супрацоўнікам аддзела ўнутраных спраў Глыбоцкага райвыканкама:

**ПАЧОПКА Людміле Аляксандраўне,** капітану міліцыі, участковаму інспектару інспекцыі па справах непаўналетніх;

**РАМАНОЎСКАЙ Ганне Яўгеньеўне,** капітану міліцыі, інспектару аддзялення па грамадзянстве і міграцыі;

**ПАШКОВІЧУ Сяргею Васільевічу,** лейтэнанту міліцыі, інспектару крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

# *Віншуем з узнагародай!*

Ганаровай граматай Глыбоцкага раённага выканаўчага камітэта ўзнагароджана за шматгадовую добрасумленную работу ў сістэме падатковых органаў, значны асабісты ўклад у забеспячэнне своечасовага паступлення ў бюджэт падатковых выплат **МАРТУЛЬ Часлава Феліксаўна,** галоўны падатковы інспектар аддзела кантролю за фізічнымі асобамі інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь па Глыбоцкім раёне.

√ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ



***Прааналізаваўшы зводку райсельгасхарча аб вытворчасці малака за адзін з ліпеньскіх дзён (дакладней – за 14 ліпеня), не мог не звярнуць увагі на вельмі нізкія паказчыкі ў філіяле “Ломашы-Агра”: валавы надой ад пачатку месяца – 74%, валавы надой за дзень – 75,1%, дзённы надой ад каровы – 9,6 кілаграма (мінус 3,6 кілаграма малака ў параўнанні з мінулым годам).***

# “Асноўная праблема – аднаўленне статка”

У гэты ж дзень разам з галоўным ветэрынарным урачом раёна Леанідам Стоцікам вырашылі наведаць гаспадарку, каб паслухаць кіраўніка, спецыялістаў, даведацца, якія яны прымаюць захады, каб палепшыць сітуацыю з вытворчасцю асноўнай таварнай прадукцыі.

Дарога – не блізкая. І мы пагаварылі пра многае, у тым ліку і пра штомесячныя калегіі райсельгасхарча, на якіх падводзяцца вынікі работы ў жывёлагадоўлі. Згадалі, што крытычныя словы ў адрас спецыялістаў філіяла “Ломашы-Агра” пачалі гучаць на калегіі ўжо з вясны. Так, на калегіі райсельгасхарча ў маі, на якой падводзіліся вынікі ў галіне жывёлагадоўлі за студзень – красавік 2014 года, было адзначана, што ў многіх гаспадарках, у тым ліку і ў філіяле “Ломашы-Агра”, на нізкім узроўні вядзецца работа па аднаўленні статка.

1.

Напачатку з дырэктарам гаспадаркі Мікалаем Ляхам пагаварылі пра нарыхтоўку кармоў для грамадскага статка ў філіяле, адзначыўшы, што віды на ўраджай кукурузы кепскія, і атрымаць у дастатковай колькасці сіласнай масы ў гэтым годзе наўрад удасца.

Кіраўнік філіяла прачытаў урывак з матэрыялу “Што падкасіла каралеву палёў?”, надрукаваны ў “Сельскай газеце”, і зазначыў:

—Не ўрадзіла кукуруза не толькі ў нас, няма кукурузы ў многіх раёнах Брэсцкай вобласці, у іншых рэгіёнах і, на думку аўтара, звязана гэта не толькі з пагоднымі ўмовамі, але і з нізкай якасцю насеннага матэрыялу. У філіяле на адным і тым жа ўчастку можна ўбачыць і развітыя сцяблінкі, і неразвітыя. У свой час мы працавалі з насеннем французскай селекцыі і былі лідарамі па ўраджайнасці кукурузы ў раёне. Сёння ж усё не так.

Па словах дырэктара, у гэтым годзе ён робіць стаўку на нарыхтоўку кармоў з траў:

—Убіраем усё, што вырасла, – натуральныя сенакосы, лугавыя пашы, няўдобіцы. Сёння на нарыхтоўцы кармоў заняты тры касілкі, кормаўборачны комплекс. Прааналізавалі ўпушчэнні, памылкі мінулага года, калі немалыя плошчы шматгадовых траў убраць мы так і не змаглі, і яны зазімавалі, і ў гэтым годзе вялікую ўвагу ўдзяляем уборцы траў другога ўкосу. Летась мы завяршылі нарыхтоўку кармоў і ўжо на другі дзень адкрылі сянажную яму, каб карміць жывёлу. У гэтым годзе такога не будзе. Выйшлі на “Гомсельмаш”, знайшлі жняярку і будзем пастаянна забяспечваць комплекс зялёнай масай. Жывёла будзе накормлена.

Па словах спецыялістаў гаспадаркі, неабходную колькасць кармоў дойны статак атрымлівае і цяпер, тэхналогія кармлення жывёлы вытрымліваецца. Вытрымліваецца, вось толькі малака няма: у параўнанні з мінулагоднім перыядам за дзень у філіяле атрымліваюць малака амаль на дзве тоны менш. Пры гэтым рэалізацыя малака застаецца на мінулагоднім узроўні, і выручка дзённая складае 29 мільёнаў рублёў. Нашмат лепшай было б фінансавае становішча філіяла, калі б вытворчасць малака складала 100%.

—Ёсць упушчэнні ў рабоце па аднаўленні статка, — тлумачыць сітуацыю Мікалай Лях. – У параўнанні з мінулым годам зрушыліся расцёлы, у выніку ў дойным статку 23% навацельных кароў, што значна менш, чым у сярэднім па раёне. Менш, чым летась, канцэнтратаў. Кепска спрацавала заатэхнічная служба, і дырэктар недагледзеў.

Калі ў некаторых гаспадарках (у прыватнасці, у ААТ “Верхнім”) спецыялісты галіны не хапае, то ў філіяле “Ломашы-Агра” ў гэтым плане поўны парадак. Галоўны заатэхнік – Вольга Сегеда, галоўны ветэрынарны ўрач – Вера Лях, асноўны асемянатар (ёсць і падмены) – Любоў Багдановіч, начальнік малочнага комплексу – Маргарыта Герасімёнак.

Як заўважыў у размове дырэктар, усе спецыялісты граматныя. У чым жа тады справа, чаму такая нізкая вытворчасць малака ў філіяле “Ломашы-Агра”?

—Малако павінна быць. А яго няма, – разводзіць рукамі Маргарыта Герасімёнак. – Па кармленні жывёлы ніякіх праблем не ўзнікае, і пагалоўе на такім жа ўзроўні, як летась, і па многіх іншых пытаннях сітуацыя прыкладна аднолькавая. А малака няма.

2.

Каб атрымаць адказ на пытанне: “Дзе малако?”, аўтар звярнуўся да першага намесніка начальніка райсельгасхарча Людмілы Данілевіч, працоўны дзень якой пачынаецца і заканчваецца у сельскагаспадарчых арганізацыях.

—Людміла Іванаўна, што сталася з вытворчасцю малака ў філіяле “Ломашы-Агра”?

—Кепска, што самі спецыялісты на месцы не могуць высвятліць прычыны нізкай прадуктыўнасці дойнага статка. Звернемся да лічбаў. З пачатку года ў філіяле расцялілася 323 галавы кароў і нецелеў – мінус 15 галоў. Калі навацельныя каровы даюць па 20 літраў малака, вось і памнажайце 15 на 20; расцялілася нецелеў з пачатку года 61 адна галава – мінус 18; атрымана цялят з пачатку года 307 – мінус 13. Лічбы гэтыя бяру са статыстыкі. Выхад цялят на сто кароў – 39 (мінус 1). Самы нізкі паказчык у раёне. Горшы толькі ў ААТ “Верхняе” – 37. Але ж там няма ні аднаго спецыяліста – ні заатэхніка, ні ветэрынарнага ўрача, ні тэхніка-асемянатара. Усю работу ў ААТ “Верхняе” праводзяць прыезджыя спецыялісты.

—Выходзіць, у філіяле “Ломашы-Агра” запушчана работа па аднаўленні статка?

—Так, запушчана. Вы ж разумееце, што такое выхад цялят 39% і выхад цялят больш за 50%. Возьмем філіял “Капыльшчыну”. Выхад цялят у філіяле – 55%, і doяць яны ад каровы 14,8 кілаграма малака. Паўгода ўжо прайшло, а ў філіяле “Ломашы-Агра” толькі 34% кароў расцялілася. І па годзе чакаецца, што выхад цялят складзе 69%. У іншых гаспадарках – 76%, 78%, 83%, 84%.

—Да канца года па вытворчасці малака філіял зможа выйсці на 100%?

—Вельмі складана гэта зрабіць. У гаспадарцы расцялілася нецелеў да наяўнасці кароў – 8%, па раёне – 18. Норма ж на год – 33 %. І як зможа выйсці на гэты паказчык філіял “Ломашы-Агра”?! Нельга змірыцца і з тым, што ў гаспадарцы пад расцёл 2015 года асеменілі 200 кароў (мінус 10). Пытанні па кармавой базе закранаць не будзем, але па ўкормленасці жывёла ў філіяле нармальная. Асноўная бяда – аднаўленне статка. Вось так аднаўленне можа загубіць малако.

**Інфармацыя райсельгасхарча**
**аб вытворчасці і продажы дзяржаве малака на 17 ліпеня 2014 года.**
**Першая графа — назва гаспадаркі, другая — валавы надой ад пачатку месяца (%), трэцяя — надой ад каровы за дзень (кг), чацвёртая — продаж малака (%).**

| | | | |
|---|---|---|---|
| “Каралі” | 107,1 | 16,3 | 112,0 |
| “Азярцы” | 106,2 | 10,7 | 110,0 |
| “Капыльшчына” | 105,7 | 14,7 | 118,0 |
| “За Радзіму” | 102,3 | 15,3 | 123,0 |
| “Галубічы” | 101,3 | 12,3 | 103,0 |
| “Мнюта” | 100,4 | 14,5 | 100,0 |
| “Птушкафабрыка” | 100,2 | 12,3 | 105,0 |
| “Яблынька” | 94,8 | 10,3 | 106,0 |
| “Прошкава” | 90,3 | 11,0 | 102,0 |
| “Чарневічы” | 90,1 | 12,3 | 110,0 |
| “Стрынадкі” | 89,9 | 12,1 | 123,0 |
| “Залатая падкова” | 87,6 | 12,7 | 92,0 |
| “Сельцы” | 87,3 | 11,1 | 98,0 |
| “К. Двор” | 82,8 | 9,8 | 88,0 |
| “Верхняе” | 75,1 | 7,7 | 99,0 |
| “Ломашы-Агра” | 74,3 | 9,6 | 95,0 |
| **Па раёне** | **88,5** | **12,01** | **114** |

√ ГАСПАДАРКА ЎЛАСНАЯ, КЛОПАТ АГУЛЬНЫ

# Сена – на панадворак

***Колькасць кароў у асабістых падсобных гаспадарках вяскоўцаў штогод змяншаецца. У многім і па той прычыне, што не проста гаспадарам нарыхтаваць на зіму кармы для жывёлы.***
***Добрую справу робяць тыя кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў, якія дапамагаюць людзям у вырашэнні многіх пытанняў, што ім самім вырашыць цяжка.***

У рэдакцыю пазваніла жыхарка вёскі Псуя Паліна Леановіч і папрасіла праз газету выказаць падзяку дырэктару сельгаспрадпрыемства “Яблынька” Віктару Гінько і старшыні прафсаюзнага камітэта Ірыне Пахілцы:

—Да кіраўніцтва нашай гаспадаркі звяртацца з якой-небудзь просьбай сто разоў не трэба, — сказала чытачка нашай газеты.—Выкажаш просьбу – і табе памогуць. Маю на ўвазе і апрацоўку прысядзібнага ўчастка, і ўборку зерневых. Трымаю кароўку ў гаспадарцы, таму папрасіла дырэктара памагчы з уборкай сена. І мне прама ў двор прывезлі рулоны. Дзякуй за клопат. А цялятак ад сваёй кароўкі я пастаянна здаю ў гаспадарку.

√ УРАДЖАЙ – 2014

# Напружанне на палях не заціхае ні на хвіліну

***Лічаныя дні застаюцца да жніва. Вядома, клопатаў у хлебаробаў прыбавіцца. Але і сёння напружанне на палях не заціхае ні на хвіліну: прадаўжаецца нарыхтоўка кармоў для грамадскага статка, сельскагаспадарчыя арганізацыі пачалі ўборку азімага рапсу, стае на палях і іншых работ.***
***Пра гэта гутарым з начальнікам аддзела раслінаводства райсельгасхарча І. І. Пачкоўскім.***

—На сённяшні дзень для грамадскай жывёлагадоўлі нарыхтавана 6,4 тысячы тон сена, што складае 148% да плана, сенажу – 130,2 тысяч тон, гэта 78%, і сіласу нарыхтавана 5,8 тысячы тон. У цэлым усіх відаў кармоў нарыхтавана 40,6 тысяч тон кармавых адзінак, на ўмоўную галаву жывёлы прыходзіцца па 11,8 цэнтнера кармавых адзінак, што на 1 цэнтнер кормаадзінак менш да ўзроўню мінулага года. Аб’ём нарыхтоўкі кармоў у параўнанні з мінулым годам складае 96%, недабор – 4%. Адставанне абумоўлена тым, што ў гэтым годзе значна менш было ўнесена азотных угнаенняў, і не ўсё, што трэба было падкарміць, падкармілі. Калі гаварыць пра забяспечанасць кармамі на адну ўмоўную галаву, то забяспечанасць складае 93%. Але пры гэтым трэба ўлічыць, што на 1300 галоў узрасло пагалоўе. Растуць травы другога ўкосу, амаль 6 тысяч гектараў іх падкармілі , і на запланаваныя рубяжы выйсці можна. Было б толькі паліва, і не падводзіла б тэхніка. Як і ў мінулым годзе, кукурузы пасеяна 6300 гектараў. Звычайна кукуруза дае 50% травяных кармоў.

—У некаторых гаспадарках, скажам, у філіяле “Ломашы-Агра”, віды на ўраджай кукурузы не надта добрыя.

—Трэба сказаць, што кукуруза набірае сілы. Былі халодныя ночы, і кукуруза адставала ў росце. Пасля таго, як правялі другую падкормку на плошчах, дзе кукуруза была слабейшая, яна пайшла ў рост.

—На “зялёным жніве” ёсць лідары.

—Скажу і пра лідараў. Калі па раёне нарыхтавана 11,8 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы, то ў сельгаспрадпрыемстве “Азярцы” – 17,4 цэнтнера, у філіяле “Стрынадкі” – 14,4 цэнтнера, ва ўнітарным прадпрыемстве “За Радзіму” – 13, 9 цэнтнера. Калі гаварыць пра сянаж, асноўны травяны від корму, то ў філіяле “Ломашы-Агра” заданне па нарыхтоўцы сенажу выканана на 110%, у філіяле “Галубічы” – на 110%, ва ўнітарным прадпрыемстве “За Радзіму” – на 103%. Што тычыцца другіх работ, то сельгасарганізацыі прыступілі да ўнясення гліфасатаў і ўздыму глебы пад азімыя культуры. Ідзе ўборка азімага рапсу, зялёнага гарошку, церабленне лёну. Не за гарамі ўборка зерневых. Разлічваем, што пасля дваццатых чысла сёлетняе жніво стартуе.

—Ураджайнасць азімага рапсу?

—Невысокая: 12 цэнтнераў з гектара. На ўраджайнасць адмоўна паўплывалі цяжкая зіма і недастатковая колькасць азотных угнаенняў.

—Віды на ўраджай зерневых культур?

— На маю думку, азімыя выглядаюць лепш. Калі гаварыць пра яравыя культуры, то ў гэтым годзе на паўтары тысячы гектараў больш пасеяна яравой пшаніцы. Ураджай павінен быць. Зрэшты, загадваць складана, пачнецца ўборка — даведаемся, якія сёлета вырас ураджай.

**Старонку падрыхтаваў Алесь ЖЫГУНОЎ. Фота аўтара.**

# Калі ёсць турыстычны брэнд, яго трэба развіваць

**У святочным нумары "ВГ", прысвечаным 600-годдзю горада, у матэрыяле "Красуй у днях сваіх, Глыбокае!" у размове з інструктарам-метадыстам па турызме фізкультурна-аздараўленчага цэнтра Алай Вярцінскай мы, адзначыўшы, што горад Глыбокае стаў цэнтрам турызму заходняга рэгёна Віцебшчыны, вялікую ўвагу ўдзялілі "Вішнёваму фестывалю", які летась прайшоў на Глыбоччыне.**



Ала Вярцінская з экспанатамі з выявай вішні.

Падчас падрыхтоўкі да сёлетняга "Вішнёвага фестывалю" вырашылі прадоўжыць тэму і засяродзілі ўвагу на такім пытанні: "Ці будзе ў Глыбокім музей вішні?". Ідэя, дарэчы, належыць маёй субяседніцы.

**—Ала Васільеўна, ці не занадта гэта – музей вішні? Ёсць жа скульптурная кампазіцыя вішні.**

—Калі ёсць турыстычны брэнд, яго трэба развіваць. Музей вішні ў Глыбокім – справа рэальная. І вялікіх высілкаў для яго стварэння не трэба. Чыста стыхійна ў мяне дома склалася экспазіцыя прадметаў з выявай вішні, прадметаў у форме вішні. Але ж гэтую работу можна і трэба праводзіць мэтанакіравана. Тэматычныя музеі заўсёды цікавыя сваёй вузкай накіраванасцю, і такіх музеяў шмат. Скажам, у расійскім гарадзе Мышкіне створаны музей мышы – па назве горада. Ёсць музей, прысвечаны яблыку. У Шклове спачатку ўстанавілі помнік агурку, а цяпер задумаліся над тым, каб стварыць музей агурка.

**—Вядомы расійскі паэт Ігар Шклярэўскі ў адным са сваіх вершаў пісаў: "Шклоў – горад агуркоў". Паколькі я сам з тых мясцін, то не магу не сказаць, што агурок там у вялікай пашане. Ужо ў пачатку чэрвеня на шклоўскім кірмашы можна было набыць маладзенькія агурочкі. І не сумняваюся, што музей агурка ў Шклове будзе створаны.**

—То, можа, не трэба сумнявацца і ў тым, што і ў Глыбокім з часам адкрыецца музей вішні. "Вішнёвы фестываль", помнік вішні – усё гэта, несумненна, добра. Але гэтага замала для развіцця вішнёвай тэматыкі. Праўда, ёсць вішнёвы сад. І, скажам так, ім вельмі цікавяцца работнікі сродкаў масавай інфармацыі. Так, нядаўна тэлекампанія "Мір" здымала ў горадзе сюжэт пра Мюнхгаўзена, пра ўстаноўлены помнік Мюнхгаўзену. А потым журналісты ўспомнілі пра вішнёвы сад і паехалі здымаць яго. Ім гэта цікава. Добра было б развіць ідэю з вішнёвым садам і сабраць у ім сарты вішань з многіх краін. Гэта будзе развіццё брэнда. Калі я была на сырным фестывалі, мяне многія распытвалі пра наш "Вішнёвы фестываль", цікавіліся, ці будзе ён праходзіць у гэтым годзе. І радаваліся, калі пачулі, што фестываль задуманы як штогадовае мерапрыемства. І, між іншым, задавалі такое пытанне: "А што яшчэ плануецца ў Глыбокім па развіцці вішнёвай тэматыкі?". Так, музея вішні ў Глыбокім пакуль няма, але, так бы мовіць, сацыяльны заказ на яго ўжо ёсць.

**—Але ж напачатку трэба стварыць канцэпцыю такога музея.**

—Акрамя экспанатаў, звязаных з вішняй, у музеі можна разгарнуць экспазіцыю па гісторыі садаводства на Глыбоччыне ў цэлым і вішняводства – у прыватнасці. Змясціць матэрыялы пра жыццё і дзейнасць Баляслава Лапыра, нашага селекцыянера, садавода, пра якога, на жаль, на Глыбоччыне ведаюць мала. Думаю, Акадэмія навук краіны пайшла б нам насустрач і дапамагла б з матэрыяламі. Ствараючы музей, варта падумаць і пра дэгустацыйную залу пры музеі, дзе можна было б пакаштаваць варэнне з вішні, чарэшні, вішнёвы кампот, іншыя прадукты з вішняй. Так, скажам, на мінулагоднім фестывалі згушчанае малако з вішняй, выробленае на МКК, мела вялікі попыт, як і вішнёвы напітак ад ААТ "КупцовЪ". Можа і так стацца, што музей вішні і дэгустацыйная зала пры ім будуць стымуляваць нашых вытворцаў, і вішнёвая тэматыка будзе хваляваць іх не толькі падчас правядзення фестывалю, але і на працягу ўсяго года. Стымул мелі б і рамеснікі, выстаўляючы свае вырабы на вішнёвую тэматыку ў музеі.

**—А як быць з будынкам для музея? Пад адкрытым небам экспанаты не размесціш.**

—Ёсць варыянты. Адзін — гэта будынак былой бібліятэкі па вуліцы Леніна. Цэнтр горада, побач – помнік вішні. Музей добра б упісаўся ў турыстычны квартал Глыбокага. Ёсць і другі варыянт – пустуе будынак (надомнай працы) на плошчы 17 Верасня. Урэшце вялікі гмах для музея вішні і не патрэбен – хапіла б і пару пакояў. Запатрабаваны ў турыстаў і брэнд, звязаны з Мюнхгаўзенам. Гэты брэнд таксама патрабуе свайго развіцця. Ён, дарэчы, лёгка ўпісваецца ў вішнёвую тэматыку. Памятаеце небыліцу барона пра тое, як ён замест кулі зарадзіў ружжо вішнёвай костачкай і выстраліў у аленя, а праз год сустрэў таго ж аленя з вішнёвым дрэвам між ягоных развесістых рагоў? У тым жа музеі можна зрабіць галаву аленя з вішнёвым дрэвам. Словам, музей вішні ў горадзе патрэбен, і ён абавязкова будзе, хай не сёння – заўтра, паслязаўтра, але будзе: "Вішнёвы фестываль" ужо атрымаў прызнанне далёка за межамі раёна і вобласці, і, каб прывабіць у горад як мага больш турыстаў, гэты брэнд трэба развіваць і развіваць.

**Алесь ЖЫГУНОЎ.**
**Фота Андрэя ПАНКРАТА.**



Фота В. ХАРЭВІЧА.

# Кампазітар Браніслаў Грамакоўскі і вішні

***Песня "Глыбокае – вішнёвы гарадок" упершыню прагучала летась на адкрыцці "Вішнёвага фестывалю" і адразу запаланіла сэрцы гараджан і гасцей горада. Песня стала адметнай візітнай карткай гэтага цікавейшага мерапрыемства. Прагучыць яна і ў гэтым годзе. У прафесіянальным запісе і ў новым выкананні.***

***Пра тое, як ствaралася песня, як ішоў запіс яе, гутарым з самадзейным кампазітарам Браніславам Грамакоўскім.***

—На пачатку мінулага года ў раённай газеце "Веснік Глыбоччыны" была змешчана тэматычная старонка "Вішнёвы фестываль у Глыбокім?", а на ёй – верш "Глыбокае – вішнёвы гарадок". Яшчэ не было вядома: будзе фестываль альбо не, і пра твор да фестывалю я і не думаў. Проста паэтычныя радкі мяне кранулі і, скарацюўшы тэкст, падрабіўшы ў ім тое-сёе, музыку напісаў лёгка і хутка. Праспяваў раз, другі – песня спадабалася. Але ж трэба было запісаць яе так, каб песня прагучала належна. І тут я ўспомніў свайго былога вучня Міхаіла Стоціка, які жыве ў Мінску і займаецца музыкай, робіць аранжыроўкі песень. Міхаіл шчыра адгукнуўся на маю просьбу, і літаральна за пару дзён да фестывалю я атрымаў фанаграму (мінус) да песні "Глыбокае – вішнёвы гарадок". І на адкрыцці фестывалю песня прагучала ў выкананні вакальнай групы.

*—На гэтым праца над песняй не закончылася. Ведаю, што падчас падрыхтоўкі да сёлетняга фестывалю вы ездзілі ў Мінск і ў Доме радыё пад фанаграму, зробленую Міхаілам Стоцікам, запісалі словы песні. І запісвалі песню па-другому, не так, як у мінулым годзе.*

—Па-другому. Найперш скажу, хто выконвае песню. Гэта Жанна Нарыцына, Эла Гімбіцкая, Алеся Германовіч, Павел Пеляёнак, Васіль Сабалеўскі і я. Кожны з удзельнікаў вакальнай групы праспяваў песню асобна, а пасля ўжо нашы галасы наклалі адзін на адзін, звялі ў адно, і песня, скажам так, атрымалася: чыстая, лірычная, святочная.

*—Утваім песенным рэпертуары больш няма твораў пра вішню?*

—Напісаных мной? Больш няма.

*—Глыбокае – вішнёвы гарадок. Цікава, а ці ёсць вішнёвы сад каля дома самадзейнага кампазітара Браніслава Грамакоўскага?*

—Саду няма, а вішні ёсць. Між іншым, шмат гадоў таму я іх сам садзіў. Сёлета год не самы ўраджайны, а вось летась з адной вішні я набраў два вядры ягад. Ёсць у мяне і слівы, ёсць маліны.

*—Выходзіць, Браніслаў Грамакоўскі – садавод?*

—Скажу так: садавод-аматар. Такіх сярод жыхароў горада шмат. Глыбоцкая вішня – сапраўды адметная. Да Шаркаўшчыны – рукой падаць, а вось такіх буйных і смачных вішань, як у нас, там няма. Таму невыпадкова Глыбокае завуць вішнёвай сталіцай, і па вішні сюды едуць з самых розных куточкаў Беларусі. Таму невыпадкова "Вішнёвы фестываль" праходзіць менавіта ў Глыбокім.

# Самая любимая ягода

***— Нынешний год – не вишнёвый: по крайней мере, для нас, — констатирует глубочанин Василий Ажель (на снимке). – Весной цветков хоть и было много, но холода не позволили пчёлам опылить их.***

***И все же семья Ажель не останется без ягод: на приусадебном участке – 15 деревьев (низкорослые сорта), с которых планируется собрать хотя бы по 5 литров вишен. В урожайные годы излишки продавали, а в основном все шло на переработку – уж очень любят в этой семье вишни. Впрочем, не удивительно, ведь это семья — глубокская.***



У многих неискушённых садоводчеством людей сложилось мнение, что вишня – она и в Африке вишня, то есть всегда кисло-сладкая. На самом деле это не так, ведь каждый сорт имеет целый букет различных вкусовых оттенков.

— На нашем участке – пять видов вишни и два вида черешни, которые отличаются не только по вкусу, но и по форме, — говорит Василий Владимирович. – Есть кисло-сладкие и мелкие, есть сладкие с горчинкой, но сама ягода крупная, мясистая, а есть с легкой кислинкой и очень сочные вишни. Одни годятся на варенье, другие – на сок, а третьи – на домашнее вино. Каждому сорту – своё хозяйское предназначение. Вишни и черешни у нас созревают периодами, начиная с первого июня и заканчивая серединой августа.

Как распорядиться вишнёвым урожаем решает Галина Николаевна – жена Василия Владимировича, который ей во всем помогает. Безусловно, ни о каком варенье не может быть и речи, если весной и осенью не дать деревьям хорошего ухода. Надо и сучья обрезать, и опылить листики лекарством, чтобы не болели, и побелить, и подкормить, чтобы дерево было здоровым и хорошо плодоносило.

— Не все так просто, как может показаться на первый взгляд, ведь и деревья подвержены заболеваниям, — говорит Василий Ажель. – Читаем рекомендации профессиональных садоводов, тематические статьи в специализированных журналах – без знаний не получится вырастить хороший урожай любых садовых культур, впрочем, год на год не приходится, и нередко затраченные на обустройства сада силы не всегда возвращаются сторицей. В этом году нам еще «помогают» с уборкой вишен скворцы, вороны, галки. Не остается ничего другого, как отпугивать птиц, иначе и тех вишен, что созрели, на деревьях не останется.

В общем, забот и Василию Владимировичу, и Галине Николаевне хватает, ведь не только вишни, но и многие другие культуры произрастают в их небольшом саду рядом с домом.

— Есть у нас виноград, груши, яблони, сливы, алыча, да и многое другое, что годится для переработки, пополнения запасов продуктов питания на зиму, — говорит Василий Владимирович. – И все же вишни для нас – самая любимая ягода.

**Текст и фото Андрея ПАНКРАТА.**



# Дзве “вішанькі” ў сям’і Андрэя і Насці Вішнеўскіх

***Калі летась напярэдадні правядзення Вішнёвага фестывалю ў Глыбокім устанавілі скульптуру спелай і сакавітай вішаньцы, Вішнеўскія з жартам адзначылі: “У наш гонар ужо і помнік у горадзе паставілі”. Ніхто тады не ведаў, што ў гэтым выказванні можа таіцца і немалая доля праўды. А сёння маладая сям’я Вішнеўскіх, якая выхоўвала паўтарагадовага сыночка, стала прыёмнай: Андрэй і Насця прынялі ў сваю сям’ю Ільюшу Зелянкевіча, які застаўся сіратой. Хлопчык хворы на цукровы дыябет, мае патрэбу ў пастаянным лячэнні і асаблівым доглядзе, а яшчэ пяцігадовы хлапчук пакутуе эпілепсіяй. І хай сабе ў гонар Вішнеўскіх помнік ставіць ранавата, але павагу грамадскасці за такі няпросты выбар і міласэрнасць яны, без сумневу, заслугоўваюць.***
***Незадоўга да вішнёвага свята, у сям’і Вішнеўскіх з’явілася яшчэ адна “вішанька” – хлопчык Ільюшка. Сімвалічна не толькі тое, што ў Андрэя і Насці прозвішча сугучнае назве фестывалю, але і тое, што свой шосты дзень нараджэння хлопчык адзначыць 17 ліпеня, за дзень да прыгожага вішнёвага свята. Як кажуць, нагода для знаёмства з сям’ёй не адна,а цэлы букет. Гэта мы і скарысталі, каб расказаць пра добрых душой маладых людзей.***

Насця – вясковая дзяўчына. Нарадзілася і вырасла ў вёсцы Мярэцкія ў шматдзетнай сям’і Леаніда Іванавіча і Тамары Гвідонаўны Косцікаў, у якой падрасталі чатыры хлопцы і дзве дзяўчынкі. Косцікі пра інваліднасць дачушкі Яны нікому надта не гавораць, з гэтым нялёгкім жыццёвым выпрабаваннем спраўляюцца самі. Жыццёвыя праблемы аб’ядноўваюць іх, загартоўваюць дух, а сэрцы бацькоў напаўняюцца спагадай і міласэрнасцю.

Нягледзячы на тое, што ў Косцікаў сваіх дзяцей шасцёра, яны яшчэ і чужым стараюцца дапамагчы. Не адзін год на канікулы і на выхадныя бралі дамоў дзвюх сястрычак, сацыяльных сіротак з Пастаўскага Дома-інтэрната. Частавалі, падарункі куплялі, прымалі, як родных. Час прайшоў, тыя дзяўчаткі даўно выраслі, самі сталі мамамі, але Тамару Гвідонаўну і яе мацярынскі клопат памятаюць да цяперашняга, сувязі з сям’ёй падтрымліваюць.

Калі ж казаць пра Насцю, то яна атрымала вышэйшую адукацыю і прафесію юрыста. Працавала ў раёне па абранай спецыяльнасці. З Андрэем, які апошнія гады жыў у Мярэцкіх, былі даўно знаёмыя, але нейкі час не бачыліся. Аднойчы, ідучы з работы, Насця выпадкова сустрэлася з хлопцам, павіталася, усміхнулася. І атрымалася ў іх, як у той песні: “З блакітнай ручаінкі пачынаецца рака, а сяброўства пачынаецца з усмешкі”. Праз год яны пажаніліся. Хутка ў сям’і нарадзіўся сын Мікітка.

— Калі прыязджалі з Андрэем у вёску да мамы, ад яе не раз чулі пра лёс Ільюшы Зелянкевіча. Мама была гатова сама прыняць у сям’ю гэтага хлопчыка, але не была ўпэўнена, што органы апекі дадуць згоду. І калі ў час чарговага прыезду нам суседзі сказалі, што раённая газета шукае для Ільюшы сям’ю, мы правялі сямейны савет. Два дні думалі і… вырашылі ўзяць Ільюшу, — расказвае Насця Вішнеўская. – Я пракансультавалася з дзіцячым урачом наконт захворвання хлапчука, прайшла спецыяльнае навучанне пры нашай бальніцы і ў Віцебску, цяпер сама раблю ўколы, ведаю, як і што рабіць, калі ў дзіцяці здарыцца прыступ.



Сям’я Вішнеўскіх: дабрыня выратуе ад адзіноты і зробіць людзей шчаслівымі.

